БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па вучэбнай рабоце і
адукацыйным інавацыям
_______________О.Н. Здрок
_______________2020 г.

Рэгістрацыйны № УД-7705/уч.

*СМІ як спецыфічная сістэма гістарычных крыніц*

**Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі**
**па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасцей:**

1-23 01 08 Журналістыка (па напрамках):
Напрамкі спецыяльнасці
1-23 01 08-01 Журналістыка (друкаваныя СМІ)
1-23 01 08-02 Журналістыка (аўдыёвізуальная)
1-23 01 08-03 Журналістыка (вэб-журналістыка)
1-23 01 10 Літаратурная работа:
Напрамак спецыяльнасці:
1-23 01 10-01 Літаратурная работа (творчасць)

2020 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове АСВА 1-23 01 08-2013, АСВА 1-23 01 10-2013 і вучэбных праграм № Е 23-263/уч., № Е 23-264/уч., № Е 23-265/уч., № Е 23-269/уч. ад 29.05.2015г., № Е 23и-255/уч., № Е 23и-256/уч., от 20.02.2015 г., № Е23з-203/вуч. ад 30.05.2013г., № Е 23з-204/уч. ад 30.05.2013г.

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**

Дарашчонак П. Л. – дацэнт кафедры перыядычнага друку і вэб-журналістыкі факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат філалагічных навук, дацэнт;

Каспяровіч-Рынкевіч В. М. – дацэнт кафедры медыялогіі факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат філалагічных навук

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

Мартысюк П. Р. – прафесар кафедры інфармацыйных тэхналогій і сацыяльна-гуманітарных дысцыплін Мінскага філіяла Расійскага эканамічнага ўніверсітэта імя Г. В. Пляханава, доктар філасофскіх навук, дацэнт;

Кананава А. І. – дацэнт кафедры міжнароднай журналістыкі факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай медыялогіі факультэта журналістыкі
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
(пратакол № 4 ад 03.12.2019г.)

Навукова-метадычным Саветам БДУ
(пратакол № 3 от 03.01.2020 г.)

Загадчык кафедры
медыялогіі факультэта журналістыкі БДУ ______________ Н. А. Фядотава

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

**Мэта і задачы вучэбнай дысцыпліны**

Мэтай вывучэння вучэбнай дысцыпліны “СМІ як спецыфічная сістэма гістарычных крыніц” з’яўляецца фарміраванне ў студэнтаў поўнай карціны фарміравання гістарычнай інфармацыі ў друкаваных перыядычных выданнях Беларусі.

Для рэалізацыі гэтай мэты мяркуецца вырашэнне наступных задач:

- авалоданне студэнтамі метадалогіі даследавання гістарычных падзей, якія знайшлі адлюстраванне ў перыядычных выданнях мінулага, для больш глыбокага асэнсавання сучаснага грамадска-палітычнага і сацыяльна-эканамічнага развіцця;
- свядомае засваенне і прымяненне вучэбнай інфармацыі, звязанай з вывучэннем СМІ ў якасці гістарычных крыніц;
- станаўленне выпускніка вышэйшай школы як грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, здольнага якасна выконваць свой прафесійны абавязак.

**Месца дысцыпліны** ў прафесійнай падрыхтоўцы выпускніка з вышэйшай адукацыяй.

Месца вучэбнай дысцыпліны “СМІ як спецыфічная сістэма гістарычных крыніц” у цыкле сацыяльна-гуманітарных дысцыплін спецыяльнага модуля па выбару студэнтаў кампанента ўстановы вышэйшай адукацыі вызначаецца прадметам яе вывучэння, якім з’яўляюцца асаблівасці функцыянавання перыядычных выданняў на тэрыторыі Беларусі ў працэсе станаўлення і развіцця нацыянальнай інфармацыйнай прасторы. У сістэме падрыхтоўкі спецыялістаў для СМІ дысцыпліна з’яўляецца адной з базавых, дзе фарміруюцца ўяўленні аб асноўных паняццях гэтай сферы. Дысцыпліна “СМІ як спецыфічная сістэма гістарычных крыніц” звязана з такімі курсамі, як “Гісторыя”, “Гісторыя беларускай журналістыкі”, “Гісторыя рускай журналістыкі”. Яе асаблівасцямі з’яўляецца тое, што перыядычны друк уяўляе сабой не асобную разнавіднасць крыніц, а спецыфічную сістэму перадачы і захавання інфармацыі, дзе камунікатыўная функцыя з’яўляецца вызначальнай.

**Патрабаванні да кампетэнцый**

Засваенне вучэбнай дысцыпліны “СМІ як спецыфічная сістэма гістарычных крыніц” павінна забяспечыць фарміраванне наступных акадэмічных, сацыяльна-асобасных і прафесійных кампетэнцый:

***акадэмічныя*** кампетэнцыі:

АК-1. Умець прымяняць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.

АК-2. Валодаць сістэмным і параўнальным аналізам.

АК-4. Умець працаваць самастойна.

***сацыяльна-асобасныя*** кампетэнцыі:

САК-2. Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння.

САК-3. Валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый.

САК-6. Умець працаваць у камандзе.

***прафесійныя кампетэнцыі:***

*Для спецвяльнасці “Журналістыка (па напрамках)”:*

ПК-2. Творча прымяняць атрыманыя веды і набытыя навыкі ў прафесійнай дзейнасці.

ПК-25. Ацэньваць гістарычныя і сучасныя праблемы і тэндэнцыі, рыхтаваць навуковыя матэрыялы, складаць рэфераты, агляды, рэцэнзіі.

ПК-27. Умець аналізаваць сацыяльна-значныя праблемы і працэсы ў кантэксце ідэалогіі беларускай дзяржаўнасці і інфармацыйнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь, якая праводзіцца.

*Для спецыяльнасці “Літаратурная работа”*

ПК-10. Рабіць супастаўляльна-тыпалагічны аналіз інфармацыйных рэсурсаў.

ПК-29. Ацэньваць гістарычныя і сучасныя праблемы, выяўляць тэндэнцыі кнігавыдавецкага і рэдакцыйнага працэсу, рыхтаваць рэцэнзіі, ажыцяўляць рэферыраванне, рабіць аналітычныя агляды.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен:

**ведаць:**

- змест паняцця сродкаў масавай інфармацыі як спецыфічнай сістэмы гістарычных крыніц;
- этапы развіцця айчыннага друку і асноўныя аспекты яго функцыянавання;
- унутраныя і знешнія фактары, якія ўплывалі на фарміраванне моўных, культурных, канфесійных асаблівасцей перыёдыкі Беларусі на розных этапах гістарычнага развіцця;

**умець:**

- аналізаваць і прагназаваць працэсы развіцця беларускіх СМІ ў кантэксце нацыянальнай інфармацыйнай палітыкі;
- тлумачыць сутнасць асаблівасцей развіцця аналітычных, інфармацыйных, мастацка-публіцыстычных жанраў на старонках газет і часопісаў у залежнасці ад відаў і тыпаў выданняў;
- апрацоўваць і інтэрпрэтаваць фактычны матэрыял з улікам набытых ведаў;
- комплексна прымяняць веды па дысцыпліне на практыцы;

**валодаць:**

- метадамі пошуку, апрацоўкі, сістэматызацыі інфармацыі ў межах курса;
- тэхнікай работы з рознымі крыніцамі інфармацыі.

**Структура вучэбнай дысцыпліны**

Дысцыпліна вывучаецца ў 2 семестры. Усяго на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “СМІ як спецыфічная сістэма гістарычных крыніц” для дзённай формы атрымання адукацыі для спецыяльнасцей 1-23 01 08-01 Журналістыка (друкаваныя СМІ), 1-23 01 08-02 Журналістыка (аўдыёвізуальная), 1-23 01 08-03 Журналістыка (вэб-журналістыка), 1-23 01 10-01 Літаратурная работа

(творчасць) адведзена 72 гадзіны, у тым ліку 34 аўдыторныя гадзіны, з іх: лекцыйныя – 16 гадзін, семінарскія заняткі – 12 гадзін, КСР – 6 гадзін.

Для завочнай формы атрымання адукацыі для спецыяльнасцей 1-23 01 08-01 Журналістыка (друкаваныя СМІ) і 1-23 01 08-02 Журналістыка (аўдыёвізуальная) адведзена 72 гадзіны, у тым ліку 8 аўдыторных гадзін, з іх: лекцыйныя – 4 гадзіны, семінарскія заняткі – 4 гадзіны.

Працаёмкасць навучальнай дысцыпліны складае 2 заліковыя адзінкі.

Форма бягучай атэстацыі – залік.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Тэма 1. Уводзіны ў дысцыпліну

Вызначэнне гістарычнай крыніцы. Паняцці “гістарычная крыніца”, “гістарычны дапаможнік”, “гістарычнае даследаванне”. Суадносіны паняццяў “рэчавая крыніца”, “археалагічная крыніца”, “музейны прадмет” і “музейны экспанат”. Прырода гістарычнай крыніцы. Гістарычная крыніца як аснова міждысцыплінарнага сінтэзу. Роля і месца крыніцазнаўства ў сістэме гістарычных навук. Узаемадзеянне крыніцазнаўства, археаграфіі, архівазнаўства і музеязнаўства. Аб’ект і прадмет крыніцазнаўства. Тэарэтычнае і прыкладное крыніцазнаўства. Гісторыя крыніцазнаўства. Класіфікацыя і сістэматызацыя гістарычных крыніц. Класіфікацыя гістарычных крыніц, яе сутнасць і мэты. Крытэрыі класіфікацыі. Сістэматызацыя гістарычных крыніц. Віды сістэматызацыі.

## Тэма 2. Тэарэтыка-метадалагічныя аспекты вывучэння сродкаў масавай інфармацыі як гістарычных крыніц

Літаратурныя творы як гістарычная крыніца. Публіцыстыка як гістарычная крыніца. СМІ як крыніца падзейнай, арыентацыйнай, канцэптуальнай, навуковай і журналісцкай інфармацыі. Актуальнасць медыяпаведамленняў. Медыяматэрыялы як інфармацыйныя і гістарычныя крыніцы. Прыдатнасць выкарыстання матэрыялаў сродкаў масавай інфармацыі ў якасці самастойнай, каштоўнай і аб’ектыўнай крыніцы. Аналіз інфармацыі з улікам тыпалагічных характарыстык выдання. Месца перыядычнага друку ў сістэме гістарычных крыніц. Уласцівасці перыядычнага друку як самастойнай гістарычнай крыніцы. Перыядычны друк як месца і спосаб публікацыі крыніц. Друк як комплекс крыніц, якія сфарміраваліся ў працэсе жыццядзейнасці грамадства ў рамках пэўнай палітычнай, ідэалагічнай ці ведамаснай накіраванасці. Асноўныя цяжкасці пры вывучэнні сродкаў масавай інфармацыі як гістарычнай крыніцы.

## Тэма 3. Фарміраванне інстытута цэнзуры і яго ўплыў на дакладнасць і праўдзівасць публікацый друку (XVIII-XIX стст.)

Першыя друкаваныя газеты-аднадзёнкі на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага ў другой палове XVI – пачатку XVII ст. З’яўленне аналітычнай публіцыстыкі рэлігійнага характару. Выхад у 1678 г. першага інфармацыйнага бюлетэня “Awizy Grodzienskie” (“Гродзенскія весці”), выданняў “Gazeta literacka Wilenska” (з 1760 г.) і “Gazeta Grodzenska” (з 1776 г.) на польскай мове. Кароль Рэчы Паспалітай Станіслаў Аўгуст Панятоўскі ў ролі цэнзара “Гродненскай газеты” і яго прапановы аб паляпшэнні зместу і якасці выдання. “Виленский вестник” і “Гродненскія весці” (1792): ідэйна-тэматычны напрамак выданняў, перыядычнасць выхаду, аўтарскі актыў.

“Московские ведомости” (1756–1917) і палітыка Кацярыны II у дачыненні да рэдактара і выдаўца М. І. Навікова. Вынікі распачатага Кацярынай II паходу супраць М. І. Навікова і пераслед выдадзенай ім літаратуры масонскага зместу.

Запіска Ф. Булгарына “О цензуре в России и о книгопечатании вообще”. Характарыстыка чатырох катэгорый чытацкай аўдыторыі Расіі ў першай чвэрці XIX ст. і прапановы аб неабходнасці фарміравання грамадскай думкі праз органы друку. Крытычныя заўвагі Булгарына аб метадах работы цэнзараў і прапановы па рэарганізацыі цэнзурных камітэтаў.

## Тэма 4. Рускамоўныя выданні ў беларусі і расіі ў XIX – пачатку XX ст.

Арганізацыя перыядычнага друку на рускай мове ў першай палове XIX ст. Стварэнне афіцыйных газет губернскіх праўленняў. Праграма “губернских ведомостей”, дзейнасць афіцыйных і неафіцыйных аддзелаў, жанравыя асаблівасці выданняў, вядучыя публіцысты губернскай прэсы.

Газета “Полоцкие епархиальные ведомости” – афіцыйнае выданне праваслаўнай царквы ў Беларусі. Тэматыка, дзейнасць рэдактараў, пастаянныя аўтары, жанравыя асаблівасці “Полоцких епархиальных ведомостей” у другой палове XIX – пачатку XX ст.

Часопіс “Вестник знания” (Санкт-Пецярбург, 1903–1918) і яго рэдактар-выдавец В. В. Бітнер. Прапаганда мовы эсперанта сярод падпісчыкаў “Вестника знания”, дзейнасць часопіса “Эсперо”.

## Тэма 5. Выданні першых гадоў савецкай улады як гістарычныя крыніцы

Матэрыялы “Правды”, галоўнай партыйнай газеты 1920–30-х гг., як гістарычная крыніца. Становішча “Правды” ў сістэме СМІ савецкай дзяржавы, прававая адказнасць журналістаў. Разнастайнасць форм публікуемых матэрыялаў “Правды”. Інфармацыйныя матэрыялы самой газеты. Выкарыстанне матэрыялаў іншых інфармацыйных выданняў. Вынікі аналізу “Правды” як гістарычнай крыніцы.

Стварэнне “Звезды” і яе дзейнасць. Перадавы артыкул на старонках “Звезды”. Адлюстраванне дзейнасці рэспубліканскіх і цэнтральных органаў улады. “Звезда” ў першай палове 1920-х гг. Рэдактары выдання ў міжваенны перыяд, іх публіцыстычная дзейнасць і жыццёвыя лёсы. Дакументы і матэрыялы беларускага ўрада на старонках “Звезды”. Праблемы індустрыялізацыі, калектывізацыі і культурнай рэвалюцыі ў газеце.

Публікацыі газеты “Известия Военно-революционного комитета г. Витебска” як гістарычныя і дакументальныя крыніцы рэвалюцыйнага часу. Рэдактары і супрацоўнікі губернскай газеты. Тэматыка міжнароднага жыцця. Падзеі ўнутранага жыцця.

### Тэма 6. СМІ як сродак ідэалагічнага ўціску. Крытэрыі праўдзівасці і дакладнасці матэрыялаў друку ў 20-50-я гг. ХХ ст.

Арганізацыя кантролю над друкаванымі сродкамі масавай інфармацыі ў 20-я гг. ХХ ст. Утварэнне Дзяржаўнага выдавецтва Беларусі і цэнтралізацыя друкарскай справы (студзень 1921 г.). Асноўныя напрамкі ідэалагічнай работы ў канцы 1920-х – пачатку 1930-х гг. Узмацненне адказнасці рэдактараў за змест выпускаемай літаратуры. Радыё як сродак камуністычнай прапаганды. Арганізацыя Камуністычнага інстытута журналістыкі (КІЖ) і ідэалагічнае выхаванне будучых журналістаў.

Маштабы рэпрэсій у дачыненні да супрацоўнікаў друку і скарачэнне колькасці газет і часопісаў у 1932–1937 гг. Публікацыі матэрыялаў пра выкрыццё "ворагаў народа" і далейшае "ачышчэнне" журналісцкіх кадраў ад "варожых элементаў" як праграма дзейнасці СМІ ў 1937–1939 гг. Самацэнзура як характэрная рыса савецкай журналістыкі часоў сталінізму.

### Тэма 7. Самвыдат у Беларусі, Расіі, краінах Балтыі і Польшчы (70–80-я гг. ХХ ст.)

Непадцэнзурныя выданні ў СССР. Беларускі самвыдат: ад вытокаў да нашых дзён. "Тамвыдат" і "старавыдат". Тры ўзроўні самвыдату ў СССР: агульнасаюзны, рэспубліканскі і мясцовы. Крыніцы інфармацыі самвыдату. Стваральнікі і "спажыўцы" альтэрнатыўнай інфармацыі. Традыцыі беларускага самвыдату ў гістарычным мінулым. Самвыдат у гады перабудовы (1985–1990). Выданні нацыянальных рухаў, грамадска-палітычных і грамадскіх арганізацый, культурных таварыстваў, рэлігійных канфесій, афіцыйных грамадскіх структур. Беларускі самвыдат у рэспубліках былога СССР.

Беларускія непадцэнзурныя выданні ў Польшчы 80-х – пачатку 90-х гг. ХХ ст. Палітычныя змены ў Польшчы пасля парламенцкіх выбараў 1989 г. і скасаванне цэнзуры. Роля беларускага самвыдату Беласточчыны ў адраджэнні беларускасці.

### Тэма 8. Друк беларускай дыяспары і выданні для нашых суайчыннікаў за мяжой (сярэдзіна ХХ – пачатак ХХІ ст.)

Газета "Беларускія навіны" (Парыж) як крыніца інфармацыі аб грамадска-палітычнай і культурна-асветніцкай працы беларусаў замежжа. Гістарычныя матэрыялы, аналітычныя артыкулы, тэма генасідызму. Матэрыялы пра падзеі ў БССР. Крыніцы фінансавання газеты і прычыны спынення яе выхаду.

Газета "Беларус" у сярэдзіне ХХ – пачатку ХХІ ст. Яе выдаўцы ў ЗША і Канадзе. Звесткі аб галоўных рэдактарах "Беларуса", адрозненне выдання ад савецкіх газет таго ж перыяду. Матэрыялы аб нацыянальных святочных

датах, важнейшых падзеях у жыцці беларускай эміграцыі. Аўтары “Беларуса” і характарыстыка іх публіцыстычнай творчасці.

“Кантакты і дыялогі” (1996–2002) – інфармацыйна-аналітычны і культуралагічны бюлетэнь Міжнароднай Асацыяцыі Беларусістаў. Рэдкалегія бюлетэня і яго галоўны рэдактар А. В. Мальдзіс. Рубрыкі бюлетэня. Матэрыялы аб мерапрыемствах і юбілейных датах беларускіх арганізацый замежжа, дзейнасці прэстыжных фондаў, выстаў. Пастаянныя аўтары рэдакцыі ў Беларусі і за мяжой.

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

Дзённая форма атрымання адукацыі

| Нумар тэмы | Назва тэмы | Количество аудиторных часов | | | | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | Семінарскія заняткі | Лабараторныя заняткі | Іншае | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1. | Уводзіны ў дысцыпліну | 2 | | 2 | | | | Апытанне, дыскусія |
| 2. | Тэарэтыка-метадалагічныя аспекты вывучэння сродкаў масавай інфармацыі як гістарычных крыніц | 2 | | 2 | | | | Апытанне, дыскусія |
| 3. | Фарміраванне інстытута цэнзуры і яго ўплыў на дакладнасць і праўдзівасць публікацый друку (XVIII-XIX стст.) | 2 | | 2 | | | 2 | Даклад, аналіз газеты “Московские ведомости” |
| 4. | Рускамоўныя выданні ў Беларусі і Расіі ў XIX – пачатку XX ст. | 2 | | 2 | | | | Дыскусія |
| 5. | Выданні першых гадоў савецкай улады як гістарычныя крыніцы | 2 | | 2 | | | | Апытанне |
| 6. | СМІ як сродак ідэалагічнага ўціску. Крытэрыі праўдзівасці і дакладнасці матэрыялаў друку ў 20-50-я гг. XX ст. | 2 | | | | | 2 | Творчае заданне аналіз любога выдання з ўказанага перыяду |
| 7. | Самвыдат у Беларусі, Расіі, краінах Балтыі і Польшчы (70–80-я гг. XX ст.) | 2 | | | | | 2 | Прэзентацыя |
| 8. | Друк беларускай дыяспары і выданні для нашых суайчыннікаў за мяжой (сярэдзіна XX – пачатак XXI ст.) | 2 | | 2 | | | | Апытанне, дыскусія |
| | **Усяго** | **16** | | **12** | | | **6** | |

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

Завочная форма атрымання адукацыі

| Нумар тэмы | Назва тэмы | Количество аудиторных часов | | | | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | Семінарскія заняткі | Лабараторныя заняткі | Іншае | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1. | Тэарэтыка-метадалагічныя аспекты вывучэння сродкаў масавай інфармацыі як гістарычных крыніц. Рускамоўныя выданні ў Беларусі і Расіі ў XIX – пачатку XX ст. | 2 | | 2 | | | | Творчае заданне аналіз любога выдання з ўказанага перыяду |
| 2. | Выданні першых гадоў савецкай улады як гістарычныя крыніцы. Друк беларускай дыяспары і выданні для нашых суайчыннікаў за мяжой (сярэдзіна XX – пачатак XXI ст.) | 2 | | 2 | | | | Апытанне, дыскусія |
| | **Усяго** | **4** | | **4** | | | | |

**ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА**

## Пералік асноўнай літаратуры


1. Ахмадулин, Е. В. История отечественной журналистики XX века : учебник для академического бакалавриата / Е. В. Ахмадулин, Р. П. Овсепян. – 2-е изд., перераб. и доп. – М. : Издательство Юрайт, 2018. – 382 с.
2. Дарашчонак, П. Л. СМІ як спецыфічная сістэма гістарычных крыніц [Электронны рэсурс] : вучэб.-метад. комплекс / П. Л. Дарашчонак. – Мінск : БДУ, 2016. – 133 с.
3. Розенберг, В. Русская печать и цензура в прошлом и настоящем / В. Розенберг, В. Якушкин.– М.: ЛЕНАНД, 2016. – 256 с.


## Пералік дадатковай літаратуры


1. Беларускае замежжа = Белорусское зарубежье / склад. Н. А. Голубева. – Мінск : Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі, 2010. – 480 с.
2. Газеты Беларусі. 1776–1975. Бібліяграфічны паказальнік / склад.: Л. М. Няхайчык, Ю. А. Ерашэвіч, В. Я. Бакуновіч. Мінск, 2003. – 322 с.
3. Говін, С. В. Канфесійны друк у Беларусі: вучэб-метад. комплекс для студэнтаў ф-та журналістыкі / С. В. Говін. Мінск : БДУ, 2008. – 287 с.
4. Грицкевич, В. П. Теория и история источниковедения / В. П. Грицкевич, С. Б. Каун, С. Н. Ходин. Минск, 2000. – 220 с.
5. Дарашчонак, П. Л. Газета «Известия Военно-революционного комитета г. Витебска» ў гады грамадзянскай вайны і замежнай ваеннай інтэрвенцыі / П. Л. Дарашчонак // Журналістыка ў суладдзі з жыццём: да 90-годдзя заслужанага дзеяча культуры Рэспублікі Беларусь, доктара філалагічных навук, прафесара Барыса Васільевіча Стральцова : зб. навук. прац / пад агул. рэд. В. П. Вараб’ёва. Мінск : БДУ, 2016. С. 253–256.
6. Дарашчонак, П. Л. Е. Р. Раманаў – рэдактар і журналіст «Могилевских губернских ведомостей» (90-я гг. XIX – пач. XX ст.) / П. Л. Дарашчонак // Гісторыя журналістыкі: урокі мінулага і практыка сучасных СМІ: матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф., Мінск. 19–20 крас. 2013 г. / пад агул. рэд. П. Л. Дарашчонка. Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2013. – С. 72–76.
7. Дарашчонак, П. Л. “Кантакты і дыялогі” (1996–2002 гг.) – інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь Міжнароднай Асацыяцыі Беларусістаў / П. Л. Дарашчонак // Международная журналистика-2016: турбулентность межгосударственных отношений и медиа : материалы V Междунар. науч.-практ. конф., Минск. 18 февр. 2016 г. / сост. Б. Л. Залесский ; под общ. ред. Т. Н. Дасаевой. Минск : Изд. центр БГУ, 2016. – С. 100–103.
8. Дарашчонак, П. Л. Юбілейны партрэт без глянцу. Як КІЖ каваў прафесіяналаў з актывістаў прэсы / П. Л. Дарашчонак // Беларус. думка. 2012. – № 11. – С. 22–29.
9. Есин, Б. И. История русской журналистики (1703–1917): учеб. пособие / Б. И. Есин. – М.: Флинта, 2000. – 464 с.

10. Ковальченко, И. Д. Исторический источник в свете учения об информации (к постановке проблемы) / Н. Д. Ковальченко // История СССР. – 1982. – № 3. – С. 129–148.
11. Лаврик, Ю. Н. Самиздат в Белоруссии / Ю. Н. Лаврик // Сов. библиогр. – 1991. – № 5. – С. 15–19.
12. «Московские ведомости» 1756–1917 гг. / ред.-сост. : Б. Н. Есин, О. П. Минаева. М. : Изд. ф-та журналистики МГУ, 2008. Ч. I; Ч. II.
13. Слука, А. Г. Беларуская журналістыка : падручнік / А. Г. Слука. – Мінск : БДУ, 2011. – 447 с.
14. Сороко, С. «Губернские ведомости» в информационном пространстве Северо-Западного края / С. Сороко // Гісторыя журналістыкі: урокі мінулага і практыка сучасных СМІ: матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 19-20 крас. 2013 г. / пад агул. рэд. П. Л. Дарашчонка. Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2013. – С. 234–240.
15. Шимолин, В. И. У истоков белорусской печати : епархиальные ведомости второй половины XIX – начала XX в. / В. И. Шимолин. – Минск : БГУ, 2010 – 199 с.
16. Choruzhy, W. Bialoruski drugi obieg w Polsce. 1981–1990 / W. Choruzhy. Bialystok: Bialoruskie Towarzystwo Historyczne, 1994. – 146 s.

## Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі і методыка фарміравання выніковай ацэнкі

Адзнака за *апытанне (удзел у дыскусіях)* на лекцыях і семінарскіх занятках ўключае:

– адказ (паўната адказу) – 60%;
– пастаноўку пытанняў – 40%.

Пры ацэньванні *пісьмовай прэзентацыі* звяртаецца ўвага на:

– ўтрыманне і паўнату раскрыцця тэмы – 35%;
– структуру і паслядоўнасць выкладу – 35%;
– крыніцы і іх інтэрпрэтацыю – 20%;
– наяўнасць вывадаў – 10%.

Ацэнка *вуснага даклада* ўключае:

– змест выступу (яснасць, доказнасць, адпаведнасць тэме і аўдыторыі) – 50%;
– кіраванне камунікацыяй (аратарскае майстэрства, узаемадзеянне з аўдыторыяй) – 25%;
– прымяненне візуальных сродкаў – 25%.

Пры ацэнцы *творчага задання* неабходна ўлічваць:

– самастойнасць і арыгінальнасць праведзенага аналізу – 60%;
– даследаванне вывучаемай феномену з розных бакоў, інтэграванне ведаў з розных абласцей – 15%;
– асобасная значнасць дасягнутых вынікаў – 25%.

Формай бягучай атэстацыі па дысцыпліне “СМІ як спецыфічная сістэма гістарычных крыніц” вучэбным планам прадугледжаны залік.

Пры фарміраванні выніковай ацэнкі выкарыстоўваецца рэйтынгавая ацэнка ведаў студэнта, якая дае магчымасць прасачыць і ацаніць дынаміку працэсу дасягнення мэтаў навучання. Рэйтынгавая адзнака прадугледжвае выкарыстанне вагавых каэфіцыентаў для бягучага кантролю ведаў і бягучай атэстацыі студэнтаў па дысцыпліне.

Прыкладныя вагавыя каэфіцыенты, якія вызначаюць ўклад бягучага кантролю ведаў і бягучай атэстацыі ў рэйтынгавую ацэнку:

– адказы на семінарах, удзел у дыскусіі – 25%;
– выкананне творчага задання – 35%;
– падрыхтоўка прэзентацыі – 20%;
– выступленне з дакладам –20%.

Рэйтынгавая адзнака па дысцыпліне разлічваецца на аснове ацэнкі бягучай паспяховасці і заліковай адзнакі з улікам іх вагавых каэфіцыентаў. Адзнака па бягучай паспяховасці складае 50%, заліковая адзнака – 50%.

## Прыкладны пералік заданняў для кіруемай самастойнай работы студэнтаў

*Тэма 3. Фарміраванне інстытута цэнзуры і яго ўплы ў на дакладнасць і праўдзівасць публікацый друку (XVIII–XIX стст.) (2 г.)*

Прааналізуйце газету “Московские ведомости” згодна са схемай:

1. Гістарычныя ўмовы і час выхаду выдання.
2. Рэгіён распаўсюджвання.
3. Патэнцыяльная чытацкая аўдыторыя.
3. Уплыў цэнзуры на праўдзівасць і дакладнасць публікацый.
4. Рэдакцыйная палітыка, змест выдання ў кантэксце часу.
5. Унутраныя і знешнія фактары, іх уплыў на фарміраванне палітычных, сацыяльна-эканамічных, культурных, моўных, канфесійных і іншых асаблівасцей выдання.
6. Жанравыя і стылістычныя асаблівасці выдання.
7. Высновы.

Форма кантролю – выступленне з дакладам.

*Тэма 6. СМІ як сродак ідэалагічнага ўціску. Крытэрыі праўдзівасці і дакладнасці матэрыялаў друку ў 20-50-я гг. XX ст. (2 г.)*

Прааналізуйце любую газету з вызначанага перыяду згодна са схемай:

1. Гістарычныя ўмовы і час выхаду выдання.
2. Рэгіён распаўсюджвання.
3. Патэнцыяльная чытацкая аўдыторыя.
3. Уплыў цэнзуры на праўдзівасць і дакладнасць публікацый.
4. Рэдакцыйная палітыка, змест выдання ў кантэксце часу.
5. Унутраныя і знешнія фактары, іх уплыў на фарміраванне палітычных, сацыяльна-эканамічных, культурных, моўных, канфесійных і іншых асаблівасцей выдання.

6. Жанравыя і стылістычныя асаблівасці выдання.
7. Высновы.
Форма кантролю – выступленне з дакладам.

*Тэма 7. Самвыдат у Беларусі, Расіі, краінах Балтыі і Польшчы (70–80-я гг. ХХ ст.) (2 г.)*

Падрыхткйцу прэзентацыю па выданнях самвыдата. Укажыце жанравую разнастайнасць, аўтараў і рэдактараў

Форма кантролю – выступленне з прэзентацыяй.

## Прыкладная тэматыка семінарскіх заняткаў для дзённай формы атрымання адукацыі

*Семінар №1. Уводзіны ў дысцыпліну*

1. Вызначэнне гістарычнай крыніцы. Аб’ект і прадмет крыніцазнаўства
2. Роля і месца крыніцазнаўства ў сістэме гістарычных навук. Узаемадзеянне крыніцазнаўства, археаграфіі, архівазнаўства і музеязнаўства
3. Гісторыя крыніцазнаўства. Перадумовы і асноўныя этапы развіцця крыніцазнаўства
4. Класіфікацыя і сістэматызацыя гістарычных крыніц

*Семінар №2. Тэарэтыка-метадалагічныя аспекты вывучэння сродка ў масавай інфармацыі як гістарычных крыніц*

1. Літаратурныя творы як гістарычная крыніца
2. Публіцыстыка як гістарычная крыніца
3. Перыядычны друк як гістарычная крыніца
4. Асноўныя цяжкасці пры вывучэнні сродкаў масавай інфармацыі як гістарычнай крыніцы

*Семінар №3. Фарміраванне інстытута цэнзуры і яго ўплы ў на дакладнасць і праўдзівасць публікацый друку (XVIII–XIX стст.)*

1. Узнікненне перыядычных выданняў і першыя крокі цэнзуры ў Вялікім Княстве Літоўскім
2. “Московские ведомости” і цэнзурная палітыка Кацярыны ІІ у дачыненні да рэдактара і выдаўца М. І. Новікава
3. Запіска Фадзея Булгарына “О цензуре в России и о книгопечатании вообще”

*Семінар №4. Рускамоўныя выданні ў Беларусі і Расіі ў ХІХ – пачатку ХХ ст.*

1. “Губернские ведомости” – афіцыйныя выданні расійскай адміністрацыі ў Беларуска-Літоўскім краі
2. Газета “Полоцкие епархиальные ведомости” – гістарычная крыніца аб дзейнасці праваслаўнай царквы ў Беларусі і Літве

3. Часопіс “Вестник знания” (1903–1918) як навукова-літаратурнае выданне для самаадукацыі

*Семінар № 5. Выданні першых гадоў савецкай улады як гістарычныя крыніцы*

1. Публікацыі газеты “Правда” ў ацэнках сучасных гісторыкаў журналістыкі

2. Газета “Звязда” (20–40-я гг. ХХ ст.): праблематыка, жанры, лёсы рэдактараў

3. Публікацыі газеты “Известия Военно-революционного комитета г. Витебска” – гістарычныя і дакументальныя крыніцы рэвалюцыйнага часу

*Семінар № 6. Друк беларускай дыяспары і выданні для нашых суайчыннікаў за мяжой (сярэдзіна ХХ – пачатак ХХІ ст.)*

1. Газета “Беларускія навіны” (Парыж) як крыніца інфармацыі аб грамадска-палітычнай і культурна-асветніцкай працы беларусаў замежжа

2. Газета “Беларус» (Нью-Ёрк, ЗША) – старэйшае з існуючых друкаванае выданне для беларусаў замежжа

3. “Кантакты і дыялогі” (1996–2002) – інфармацыйна-аналітычны і культуралагічны бюлетэнь Міжнароднай Асацыяцыі Беларусістаў

## Прыкладная тэматыка семінарскіх заняткаў для завочнай формы атрымання адукацыі

*Семінар №1. Тэарэтыка-метадалагічныя аспекты вывучэння сродка ў масавай інфармацыі як гістарычных крыніц. Рускамоўныя выданні ў Беларусі і Расіі ў ХІХ – пачатку ХХ ст.*

1. Вызначэнне гістарычнай крыніцы. Аб’ект і прадмет крыніцазнаўства

2. Роля і месца крыніцазнаўства ў сістэме гістарычных навук

3. Класіфікацыя і сістэматызацыя гістарычных крыніц

4. Перыядычны друк як гістарычная крыніца

5. Асноўныя цяжкасці пры вывучэнні сродкаў масавай інфармацыі як гістарычнай крыніцы

6. “Губернские ведомости” – афіцыйныя выданні расійскай адміністрацыі ў Беларуска-Літоўскім краі

7. Газета “Полоцкие епархиальные ведомости” – гістарычная крыніца аб дзейнасці праваслаўнай царквы ў Беларусі і Літве

*Семінар № 2. Выданні першых гадоў савецкай улады як гістарычныя крыніцы. Друк беларускай дыяспары і выданні для нашых суайчыннікаў за мяжой (сярэдзіна ХХ – пачатак ХХІ ст.).*

1. Публікацыі газеты “Правда” ў ацэнках сучасных гісторыкаў журналістыкі

2. Газета “Звязда” (20–40-я гг. ХХ ст.): праблематыка, жанры, лёсы рэдактараў

3. Газета “Беларускія навіны” (Парыж) як крыніца інфармацыі аб грамадска-палітычнай і культурна-асветніцкай працы беларусаў замежжа

4. Газета “Беларус» (Нью-Ёрк, ЗША) – старэйшае з існуючых друкаванае выданне для беларусаў замежжа

5. “Кантакты і дыялогі” (1996–2002) – інфармацыйна-аналітычны і культуралагічны бюлетэнь Міжнароднай Асацыяцыі Беларусістаў

## Апісанне інавацыйных падыходаў і метадаў да выкладання вучэбнай дысцыпліны

Пры арганізацыі адукацыйнага працэсу выкарыстоўваюцца:

– ***метад вучэбнай дыскусіі***, які прадугледжвае ўдзел студэнтаў у мэтанакіраваны абмене думкамі, ідэямі для прад’яўлення і / або ўзгаднення існуючых пазіцый па пэўнай праблеме.

Выкарыстанне метаду забяспечвае з’яўленне новага ўзроўню разумення, вывучаемай тэмы, прымяненне ведаў (тэорый, канцэпцый) пры вырашэнні праблем, вызначэнне спосабаў іх вырашэння.

– ***метады і прыёмы развіцця крытычнага мыслення,*** якія ўяўляюць сабой сістэму, якая фарміруе навыкі працы з інфармацыяй у працэсе чытання і пісьма; разумення інфармацыі як адпраўнага, а не канчатковага пункта крытычнага мыслення.

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі самастойнай работы навучэнцаў

Бягучая самастойная праца студэнтаў накіравана на паглыбленне і замацаванне ведаў, навыкаў праектнай працы, развіццё практычных уменняў.

Самастойная праца падзелена на тры ўзроўні: узровень пазнавання; ўзровень агучвання і ўзровень прымянення атрыманых ведаў.

Заданні першага ўзроўню – аналіз тэарэтычнага матэрыялу. Тэзісы, канспектаванне.

Заданні другога ўзроўню – прымяняюцца праблемныя і навукова-даследчыя задачы. Сістэматызацыя ыядомай інфармmацыі і прадстаўленне ў форме прэзентацыі.

Заданні трэцяга ўзроўню накіраваны на прымяненне атрыманых ведаў пры вырашэнні практычных задач. Аналіз СМІ як гістарычнай крыніцы.

## Тэмы рэфератыўных работ

1. Літаратурныя творы як гістарычная крыніца

2. Публіцыстыка як гістарычная крыніца

3. СМІ як крыніца падзейнай, арыентацыйнай, канцэптуальнай, навуковай і журналісцкай інфармацыі

4. Уласцівасці перыядычнага друку як самастойнай гістарычнай крыніцы. Перыядычны друк як месца і спосаб публікацыі крыніц

5. Асноўныя цяжкасці пры вывучэнні сродкаў масавай інфармацыі як гістарычнай крыніцы

6. Першы інфармацыйны бюлетэнь “Awizy Grodzienskie” (“Гродзенскія весці”)

7. Структура і змест “Gazeta literacka Wilenska” і “Gazeta Grodzenska”

8. Арганізацыя перыядычнага друку на рускай мове ў першай палове XIX ст.

9. Тэматыка, дзейнасць рэдактараў, пастаянныя аўтары, жанравыя асаблівасці “Полоцких епархиальных ведомостей” у другой палове XIX – пачатку XX ст.

10. Прапаганда мовы эсперанта сярод падпісчыкаў “Вестника знания”, дзейнасць часопіса “Эсперо”

11. Разнастайнасць форм публікуемых матэрыялаў “Правды”

12. Перадавы артыкул на старонках “Звезды”

13. Дакументы і матэрыялы беларускага ўрада на старонках “Звезды”

14. Арганізацыя Камуністычнага інстытута журналістыкі (КІЖ) і ідэалагічнае выхаванне будучых журналістаў

15. Самвыдат у гады перабудовы (1985–1990)

16. Беларускія непадцэнзурныя выданні ў Польшчы 80-х – пачатку 90-х гг. XX ст.

17. Гістарычныя матэрыялы, аналітычныя артыкулы газеты “Юеларускія навіны”

18. Матэрыялы аб важнейшых падзеях у жыцці беларускай эміграцыі на старонках газеты “Беларус”

19. Матэрыялы аб мерапрыемствах і юбілейных датах беларускіх арганізацый замежжа, дзейнасці прэстыжных фондаў, выстаў ў бюлетэні “Кантакты і дыялогі”

**Прыкладны пералік пытанняў да заліку**

1. Вызначэнне гістарычнай крыніцы. Аб’ект і прадмет крыніцазнаўства

2. Роля і месца крыніцазнаўства ў сістэме гістарычных навук. Узаемадзеянне крыніцазнаўства, археаграфіі, архівазнаўства і музеязнаўства

3. Гісторыя крыніцазнаўства. Перадумовы і асноўныя этапы развіцця крыніцазнаўства

4. Класіфікацыя і сістэматызацыя гістарычных крыніц

5. Літаратурныя творы як гістарычная крыніца

6. Публіцыстыка як гістарычная крыніца

7. Перыядычны друк як гістарычная крыніца

8. Асноўныя цяжкасці пры вывучэнні сродкаў масавай інфармацыі як гістарычнай крыніцы

9. Узнікненне перыядычных выданняў і першыя крокі цэнзуры ў Вялікім Княстве Літоўскім

10. “Московские ведомости” і цэнзурная палітыка Кацярыны II у дачыненні да рэдактара і выдаўца М. І. Навікова

11. Запіска Фадзея Булгарына “О цензуре в России и о книгопечатании вообще”

12. “Губернские ведомости” – афіцыйныя выданні расійскай адміністрацыі ў Беларуска-Літоўскім краі

13. Газета “Полоцкие епархиальные ведомости” як гістарычныя крыніцы аб дзейнасці праваслаўнай царквы ў Беларусі і Літве

14. Часопіс “Вестник знания” (1903–1918) як навукова-літаратурнае выданне для самаадукацыі

15. Публікацыі газеты “Правда” ў ацэнках сучасных гісторыкаў журналістыкі

16. Газета “Звязда” (20–40-я гг. XX ст.): праблематыка, жанры, лёсы рэдактараў

17. Публікацыі газеты “Известия Военно-революционного комитета г. Витебска” – гістарычныя і дакументальныя крыніцы рэвалюцыйнага часу

18. Арганізацыя кантролю над друкаванымі СМІ ў 20-я гг. XX ст. Стварэнне Галоўнага ўпраўлення па справах літаратуры і выдавецтваў

19. Асноўныя напрамкі ідэалагічнай работы друкаваных СМІ ў канцы 20-х – пачатку 30-х гг. XX ст.

20. Непадцэнзурныя выданні ў СССР . Беларускі самвыдат: ад вытокаў да нашых дзён. “Тамвыдат” і “старавыдат”

21. Незалежны самвыдат у гады перабудовы (1985–1990)

22. Беларускі самвыдат у рэспубліках былога СССР

23. Беларускія непадцэнзурныя выданні ў Польшчы 80-х – пачатку 90-х гг. XX ст. (Беласточчына)

24. Газета “Беларускія навіны” (Парыж) як крыніца інфармацыі аб грамадска-палітычнай і культурна-асветніцкай працы беларусаў замежжа

25. Газета “Беларус” (Нью-Ёрк, ЗША) – старэйшае з існуючых друкаванае выданне для беларусаў замежжа

26. “Кантакты і дыялогі” (1996–2002) – інфармацыйна-аналітычны і культуралагічны бюлетэнь Міжнароднай Асацыяцыі Беларусістаў

**ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ УВА**

| Назва вучэбнай дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы змен ў змесце вучэбнай праграмы установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму (з указаннем даты і нумара пратакола) |
|---|---|---|---|
| 1. “Гісторыя” | Медыялогіі | Няма | Змены ў змесце вучэбнай праграмы не патрабуюцца (пратакол № 4 ад 03.12.2019 г.) |
| 2. “Гісторыя беларускай журналістыкі” | Перыядычнага друку і вэб-журналістыкі | Няма | Змены ў змесце вучэбнай праграмы не патрабуюцца (пратакол № 4 ад 03.12.2019 г.) |
| 3. “Гісторыя рускай журналістыкі” | Перыядычнага друку і вэб-журналістыкі | Няма | Змены ў змесце вучэбнай праграмы не патрабуюцца (пратакол № 4 ад 03.12.2019 г.) |

**ДАПАЎНЕННІ І ЗМЕНЫ ДА ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ ПА ВЫВУЧАЕМАЙ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ**
**на _____ / _____ вучэбны год**

| № п/п | Дапаўненні і змены | Падстава |
|---|---|---|
| | | |

Вучэбная праграма перагледжана і адобрана на пасяджэнні кафедры ______________________________(пратакол № ____ ад ________20__ г.)

Загадчык кафедры
______________________ ________________ ___________________

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дэкан факультэта
______________________ ________________ ___________________